# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2024 года*

**10 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Прачытайце затранскрыбіраваныя словы (пададзены без уліку націску). У графе «**Правільна»** табліцы насупраць правільнай транскрыпцыі пастаўце «плюс» (+), насупраць няправільнай напішыце правільную транскрыпцыю.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Транскрыпцыя | Правільна |
|---|---|
| [законадаўства] | |
| [б’эзым’эн:ы] | |
| [высакайакасны] | |
| [з’м’эн’л’івы] | |
| [γ’ейам’этрычны] | |
| [індустрыйал’ізацыйа] | |

**Заданне 2.** Учытайцеся ўважліва ў фармулёўкі значэнняў мнагазначнага слова ***ЗАЛАТЫ***. Запішыце прыклады (сказы або словазлучэнні) для кожнага значэння гэтага слова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова | Прыклады |
|---|---|---|
| 1 | Бліскуча-жоўты, падобны колерам да золата | |
| 2 | Вытканы, вышыты пазалочанымі ніткамі | |
| 3 | Які складаецца з золата, з’яўляецца золатам | |
| 4 | Шчаслівы, радасны (перан.) | |
| 5 | Вельмі добры па сваіх якасцях; цудоўны, выдатны | |
| 6 | Дарагі, любімы (зваротак; перан.) | |

**Заданне 3.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў, выкарыстоўваючы прапанаваныя ў наступным абзацы словы. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *галава, карак, лыжа, лязо, масток, на, па, пальчатка*.

**Заўвага:** назоўнікі трэба ўжыць у форме патрэбнага склону і ліку.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *вастрыць* | ‘збірацца, намервацца ісці, ехаць, адпраўляцца куды-н.’ | |
| *ездзіць* | ‘здзекавацца з каго-н., прыгнятаць, выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах’ | |
| *кідаць* | ‘уступаць у барацьбу з кім-, чым-н., рабіць рашучы выклік каму-, чаму-н.’ | |
| *мыліць* | ‘моцна прабіраць каго-н., выгаворваць з дакорам’ | |
| *перакідаць* | ‘непрыкметна пераходзіць ад адной тэмы размовы да другой’ | |
| *хадзіць* | ‘рызыкаваць жыццём, быць у небяспецы’ | |

**Заданне 4.** Зменная частка слова, якая служыць для сувязі слоў у сказе, – гэта канчатак. Ці ўсе словы маюць канчатак? Ці заўсёды канчатак з’яўляецца матэрыяльна выражаным? Што абазначае паняцце «нулявы канчатак»? І, урэшце, ці ёсць словы, якія маюць два канчаткі? Правільныя адказы на гэтыя пытанні вам трэба ўспомніць для выканання наступнага задання: 1) размяркуйце прапанаваныя словы па асобных слупках табліцы; 2) у кожным слове (дзе гэта магчыма) вызначце канчатак.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Камусьці, ёй, па-беларуску, адчуваючы, восемсот, дзесьці, жалюзі, сякі-такі, уцёк, здароўе, сумленна, абыякавы.*

| Словы, якія не маюць канчатка | Словы з нулявым канчаткам | Словы з матэрыяльна выражаным канчаткам | Словы з двума канчаткамі (у тым ліку нулявымі) |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 5.** Утварыце ад прапанаваных назоўнікаў адносныя прыметнікі і запішыце іх у табліцу.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| Назоўнік | Прыметнік | Назоўнік | Прыметнік |
|---|---|---|---|
| *Смалявічы* | | *Дуброўна* | |
| *Хойнікі* | | *Нарач* | |
| *Куба* | | *Навагрудак* | |
| *Падароск* | | *Добрынь* | |
| *Старыя Дарогі* | | *Сула* | |
| *Аўцюкі* | | *Івянец* | |

**Заданне 6.** Значная колькасць маўленчых памылак звязана з дапушчэннем плеаназму, таўталогіі, неразмежаваннем паронімаў. Назавіце тып дапушчаных у сказе памылак. Запішыце выпраўлены варыянт сказа.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | **Сказ** |
|---|---|
| А | Такое ўзаемадзеянне паміж гаспадаркай і навучальнымі ўстановамі традыцыйнае і было заўсёды. |
| Б | Гарадскі суботнік праходзіць у межах месячніка па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку. |
| В | Баявое хрышчэнне салдат атрымаў у Сталінградскай бітве. |
| Г | Жыхары горада спявалі папулярныя хіты розных гадоў. |
| Д | Значэнне Беларускай АЭС для энергічнай бяспекі нашай краіны проста велізарнае. |
| Е | Прафсаюз пастаянна ставіць перад органамі дзяржаўнага кіравання пытанні гарантыйнай аплаты працы рабочых і спецыялістаў, занятых у сістэме адукацыі. |

| **Сказ** | **Тып памылкі (у выпадку яе наяўнасці)** | **Выпраўлены варыянт** |
|---|---|---|
| А | | |
| Б | | |
| В | | |
| Г | | |
| Д | | |
| Е | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Была в деревне своя церквушка, как и положено, на высоком чистом месте, хорошо видная издали с той и другой протоки; церквушку эту в колхозную пору приспособили под склад. Правда, службу за неимением батюшки она потеряла еще раньше, но крест на возглавии оставался, и старухи по утрам слали ему поклоны. Потом и крест сбили. В последние годы дважды на неделе садился на старом выгоне самолет, и в город ли, в район народ приучился летать по воздуху. *(По В. Распутину.)*

**Заданне 8.** Вызначце і запішыце ў **радку А** родавую прыналежнасць пазначаных у **радку Б** твораў. У **радку В** запішыце нумары наступных твораў паводле іх роду.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

1. «Пінская шляхта» Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча
2. «Мая дудка» Францішка Багушэвіча
3. «Роднае карэнне» Максіма Гарэцкага
4. «Бондар» Змітрака Бядулі
5. «Насцечка» Кузьмы Чорнага
6. «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы
7. «Ганарысты парсюк» Кандрата Крапівы
8. «Лебядзіны скіт» Уладзіміра Караткевіча
9. «Проня» Аляксея Пысіна
10. «Маці» Аркадзя Куляшова
11. «Любоў мая…» Яўгеніі Янішчыц

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **А** | | | | |
| **Б** | «Курган»<br>Янкі Купалы | «Роднае слова»<br>Дануты Бічэль | «Паўлінка»<br>Янкі Купалы | «Багіра»<br>Янкі Маўра |
| **В** | | | | |

**Заданне 9.** З прыведзеных ніжэй назоўнікаў і прыметнікаў узнавіце назвы твораў беларускай літаратуры і назавіце іх аўтараў.

**Заўвага.** Прыметнікі і назоўнікі пададзены ў пачатковай форме – пры ўзнаўленні можа спатрэбіцца змена граматычнай формы. Сярод прыметнікаў ёсць лішнія.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Беларускі, асаблівы, залаты, крывавы, непаўторны, незагойны, новы, родны, яблычны.*

*Зямля, карэнне, рана, вясна.*

| **Аўтар** | **Назва твора** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10.** Уважліва разгледзьце карціну Марка Шагала і прачытайце вершы. Уявіце сябе рэдактарам альбома, у якім на адной старонцы будуць размешчаны творы розных відаў мастацтва: жывапісу і літаратуры. Падбярыце да карціны адзін з прапанаваных вершаў і прывядзіце тры аргументы ў карысць вашага выбару.

Прыдумайце арыгінальную назву гэтаму альбому і напішыце невялікую анатацыю (да 50 слоў), у якой адлюструйце мэту стварэння альбома, для каго ён прызначаны, «абыграйце» назву альбома.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***



*Марк Шагал «Акно ў сад» (1917)*

***

Зямля з блакітнымі вачамі –
Святло азёр, прастор лугоў!
Тут называюць Васількамі
На Беларусі хлапчукоў.

Звіняць крыніцы, як цымбалы,
Сцяжынкі свецяць у лясах.
Палі, узгоркі, перавалы –
Прасторны шлях, далёкі шлях!

Краіна славы партызанскай,
Краіна міру і даброт!
Ты – наша гордасць,
Наша казка,
Як сонца, добры твой народ.

Тваё сыны,
Твае унукі,
Мы любім гул тваіх бароў.
І рэкі цягнуцца, як рукі,
Да чыстых рэк тваіх сяброў.

*Эдзі Агняцвет*
*1976*

**Сад**

Галлё панадна разлапушыў
За хатай прадзедавай сад;
Чарэшні, яблыні і грушы
Сышліся згодліва у рад.

Ківаюць макаўкамі ўдала,
Плывуць напевы ад галін,
Як бы з іх кожная ўзывала:
«Хадзі, бяспутнік, адпачынь!

Хадзі, усядзься каля нас ты,
Жыцця прыгод забудзь напасць,
Паслухай музыкі лісцястай:
Яна табе гарт новы дасць.

Ты многа йшоў, блудзіў ты многа,
Жадання крыж ты нёс і нёс,
Аж на расстайных стаў дарогах;
Цяпер – да нас ад бур і слёз!..»

Так быццам вабіць сад лісткамі
Пад цень свой думку многа лет;
А думка – што? яна з вятрамі,
Не знай, за чым ляціць у свет...

*Янка Купала*
*1911*

**Мір гэтаму дому**

Мір гэтаму дому,
Дзе шчасце мы бачылі ўсе…
Вецер шматкі саломы
Па мокраму снегу нясе,
Дожджык імжыцца ціхі
(Вясковы вячэрні час),
Карова з добрымі ўздыхамі
Глядзіць з-за сена на нас;
Курка з цёплага поклада
Кудахча, бы знесла сусвет…
Прытульны, добры і цёплы
Наш беларускі свет.
Садок да рачулкі збягае,
Хатка глядзіцца ў плёс.
……..
Арлы на свет вылятаюць
З такіх менавіта гнёзд.

*Уладзімір Караткевіч*
*1957?*

***На адной старонцы будуць размешчаны карціна Марка Шагала і верш***

______________________________________________

***Аргументы для такой прапановы:***

______________________________________________

______________________________________________

***Альбом будзе называцца***

______________________________________________

______________________________________________

***Анатацыя альбома***

______________________________________________

______________________________________________